сумесных праектаў можа ў доўгатэрміновай перспектыве забяспечыць уключэнне музеяў Беларусі ў міжнародную музейную прастору.

Беларусь знаходзіцца на перакрыжаванні культур і цывілізацый. Яна выступае сувязным звяном паміж Заходняй і Усходняй Еўропай, аб’ядноўваючы беларускія, польскія, украінскія, літоўскія і рускія культурныя элементы, а таксама заходнюю і славянскую моўную гісторыю. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў еўрапейскіх музейных, выставачных і калекцыйных канцэпцыях, у гарадскіх музейных цэнтрах і экалагічным турызме, у высокіх адукацыйных стандартах для музеяў і крэатыўных стратэгіях выжывання. Хацелася б, каб ініцыятыву па абмене вопытам з боку беларускіх музеяў актыўна падтрымалі іншыя еўрапейскія музеі, паколькі такія задачы, як існаванне ў новых фінансава-эканамічных умовах, пазіцыянаванне на рынку шляхам увядзення новых паслуг, алічбоўка музейных збораў, стаяць перад кожным музеем.

Неабходна адзначыць, што адзін беларускі музей у Германіі ўсё ж прадстаўлены. Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з’яўляецца членам аб’яднання Германа-Расійскага музея «Берлін-Карлсхорст». З пункту погляду музейных спецыялістаў хацелася б, каб колькасць кантактаў ва ўмовах глабалізацыі павялічвалася.



Тамара Джумантаева

кандыдат культуралогіі,
дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
(г. Полацк, Беларусь)

# Стратэгія захавання культурнай спадчыны Полацка як фактар устойлівага развіцця музея-запаведніка

У эпоху глабалізацыі постіндустрыяльная цывілізацыя ўсвядоміла высокі патэнцыял культурнай спадчыны, неабходнасць яго захавання і эфектыўнага выкарыстання як аднаго з важнейшых рэсурсаў сусветнай супольнасці. Любыя страты спадчыны непазбежна адбіваюцца на ўсіх абсягах жыцця сучаснага і будучых пакаленняў, прыводзяць да духоўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняпаду, разрываў гістарычнай памяці, збядненню грамадства ў цэлым. Яны не могуць быць узноўлены ці кампенсаваны. Асновай развіцця цывілізацыі можа быць толькі памнажэнне і захаванне культурных каштоўнасцей.

Полацк — унікальная гістарычная тэрыторыя нашай краіны. Самы старажытны беларускі горад захаваў шмат матэрыяльных і духоўных артэфактаў, якія сведчаць пра яго асобае становішча ў гісторыі і культуры нашай краіны. Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці, сталіца незалежнага княства, што прасціралася ад Рыгі да Смаленска і ад Пскова да Мінска. Гэты горад быў цэнтрам кніжнай культуры, дзе з'явіліся першыя на Беларусі бібліятэкі і манастырскія школы. Дарэчы, першы вядомы нам з летапіснай гісторыі манастыр быў створаны таксама ў Полацку першай усходнеславянскай Святой — Еўфрасінняй Полацкай. Тут быў пабудаваны першы каменны храм Беларусі — Сафійскі сабор, з якога пачалося фарміраванне адметнай ва ўсёй гісторыі архітэктуры Полацкай школы дойлідства. Яна, у сваю чаргу, паўплывала на развіццё храмавага будаўніцтва ў Вялікім Ноўгарадзе, Смаленску і іншых архітэктурных цэнтрах. Полацк стаў радзімай не толькі Святой апякункі Беларусі, але і знакамітага дойліда Іаана, які пабудаваў для Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра Спаса-Праабражэнскую царкву, не менш вядомага ювеліра Лазара Богшы, які для названай царквы стварыў напрастольны крыж. У старажытным Полацку нарадзіліся і праславілі яго першадрукар Францыск Скарына, а таксама асветнік, педагог, паэт, драматург і царкоўны дзеяч Сімяон Полацкі. У гэтым горадзе быў адкрыты адзін з першых беларускіх універсітэтаў, у якім вучыліся ці працавалі людзі, чые імёны добра вядомы ў сусветнай культуры: Габрыэль Грубер, Ян Баршчэўскі, Валенцій Ваньковіч, Фёдар Талстой, Іван Хруцкі і інш. Пэўны ўплыў на фарміраванне асоб, якія пакінулі відавочны след у гісторыі і культуры Полацка, аказалі знакамітыя полацкія музейныя зборы, таму пытанні захавання музейных традыцый з'яўляюцца надзвычай актуальнымі.



Старажытны Полацк захаваў шматгадовыя музейныя традыцыі, таму стварэнне буйнога музейнага аб'яднання на яго тэрыторыі было відавочнай справай. Пастановы партыі і ўрада (1967—1985) былі своечасовым працягам тэндэнцыі да неабходнасці захавання спадчыны ў новых умовах і на новай юрыдычнай базе. Пасля распаду СССР і звядзення да мінімуму бюджэтных асігнаванняў на культуру ўскладніўся стан утрымання культурна-гістарычнай спадчыны. Незалежныя дзяржавы, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь, былі пастаўлены перад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемай прыняцця рашучых мер па захаванню спадчыны. Станоўчыя вынікі ў дасягненні мэт належнага захавання і годнага выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны можна будзе атрымаць толькі пры ўмове ўсведамлення ўсіх асаблівасцей нацыянальнай культуры і выкарыстання назапашанага папярэднімі пакаленнямі вопыту ў гэтай справе. Адсюль вынікае неабходнасць вывучэння працэсаў інтэрпрэтацыі, рэстаўрацыі, кансервацыі, музеефікацыі і прэзентацыі культурнай спадчыны нашай краіны і асобных гістарычных тэрыторый.

За перыяд з 1985 г. па сённяшні дзень Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік пабудаваў трывалую структуру, якая адпавядае сучасным патрабаванням музейнай інтэграцыі. У будучым у Полацку можна будзе стварыць шэраг іншых музеяў (старога горада, зброі, археалогіі, ганзейскага гандлю, знакамітых палачан, літаратуры, народнай медыцыны і інш.), якія стануць складовай часткай запаведніка.

Аб’ектамі музейнага паказу сталі не толькі асобныя артэфакты, але і археалагічныя, архітэктурныя помнікі, ансамблі гарадской забудовы і гістарычныя ландшафты. У выніку музеефікацыі ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі горада з’явіліся новыя экспазіцыйныя ідэі, музейная педагогіка стала самастойным напрамкам работы, у музейнай практыцы сталі выкарыстоўвацца камп’ютарныя тэхналогіі і іншыя інавацыі. Развіццё мультымедыйных тэхналогій адкрыла новыя магчымасці для выхаду музеяў Полацка ў сусветную культурную прастору. У будучым аб’ектам музеефікацыі павінен стаць увесь гістарычны цэнтр горада.



Музей-запаведнік выпрацаваў асноўныя прыярытэты, крытэрыі і напрамкі ў комплексным захаванні культурнай спадчыны Полацка, якія былі пакладзены ў аснову стратэгіі яе захавання: неабходнасць стварэння сучаснага рэстаўрацыйнага цэнтра, укамплектаванага кваліфікаванымі кадрамі; неабходнасць музеефікацыі археалагічных аб’ектаў; стварэнне ўмоў, якія дапамогуць пазбегнуць шкоднай нагрузкі на аб’екты. Новая стратэгія будуецца на аснове збалансаваных і гарманічных адносін паміж патрабаваннямі грамадскасці, эканамічнай дзейнасці і аховы гістарычнага асяроддзя. Яна павінна прывесці да прызнання агульнай адказнасці за захаванне спадчыны.

На працягу доўгага часу ахоўваліся асобныя помнікі без уліку іх акружэння. Спецыфіка культурнай спадчыны Полацка дыктуе спалучэнне пааб’ектнай, асяроддзевай і горадабудаўнічай практык. Прадметы аховы культурнай спадчыны — гэта ключавыя элементы, параметры, характарыстыкі асяроддзя, якія з’яўляюцца носьбітамі гістарычнай, архітэктурнай, мастацкай каштоўнасці. Побач з асобнымі аб’ектамі культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спадчыны ахоўваюцца і галоўныя горадабудаўнічыя прынцыпы. Найвышэйшую каштоўнасць уяўляюць аб'ёмна-прасторавы планіровачны каркас, канфігурацыя цэнтральных водных прастораў, агульнагарадскі сілуэт, панарамы рэк, ансамблі плошчаў, перспектывы асноўных вуліц. Прадметам аховы з'яўляецца характар асяроддзя, які ўключае планіровачны модуль кварталаў і ўчасткаў, маштаб, высотнасць і чляненне забудовы. Горадабудаўнічая ахова прадугледжвае рэжым археалагічных даследаванняў для найбольш ранніх і каштоўных участкаў культурнага слою, пошукавыя і маніторынгавыя мерапрыемствы. Асаблівасць ахоўнага заніравання ў Полацку — зона аховы гістарычнага цэнтра, дзе павінна быць забаронена новае будаўніцтва (за выключэннем мер, накіраваных на рэгенерацыю гістарычнага асяроддзя і прыстасаванне аб'ектаў культурнай спадчыны для сучаснага выкарыстання). У зоне рэгулявання забудовы павінны быць устаноўлены дыферэнцыраваныя рэжымы абмежаванняў, якія дапускаюць рэканструкцыю без змяненняў планіровачнай структуры, асноўных асяроддзевых характарыстык.

Пагрозы фізічнай страты (разбурэння) аб'ектаў спадчыны звязаны з працэсамі старэння, якія паскараюць неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, структурна-няўстойлівыя грунты паблізу басейнаў рэк, атмасферныя забруджванні, некантралюемая ўрбанізацыя і рух аўтатранспарту, недарэчнае новае будаўніцтва ў гістарычным асяроддзі, няправільны рэжым эксплуатацыі будынкаў і інш. Для захаванасці аб'ектаў культурнай спадчыны ўяўляе небяспеку таксама інтэнсіўны турызм, які прыводзіць да празмернай нагрузкі на аб'екты. Згубныя «татальныя» рэстаўрацыі, якія наносяць шкоду аўтэнтычнасці помніка. Для кожнага віду небяспекі і тыпу гістарычных збудаванняў належыць распрацаваць прафілактычныя меры з комплексам арганізацыйных, адміністрацыйных і тэхнічных мерапрыемстваў па прадухіленні пагроз, зніжэнні страт, а таксама пастаянна праводзіць маніторынг становішча і прагноз развіцця.

Рэстаўрацыя — мера вымушаная, надзвычайная, яна прадугледжвае глыбокае ўмяшанне ў сапраўдную тканіну помніка, цягне за сабой элементы ўзнаўлення і знішчае часцінку аўтэнтычнасці. Венецыянская хартыя, якая зацвердзіла міжнародныя прынцыпы рэстаўрацыі, аддае перавагу кансервацыі, а рэстаўрацыя праводзіцца ў выключных выпадках, калі іншыя спосабы захавання бяссільныя. Школа сапраўднай рэстаўрацыі з выкарыстаннем традыцыйных тэхналогій, руплівым даследаваннем арыгінальных фрагментаў помнікаў, іканаграфічных і архіўных матэрыялаў у дадзены момант у краіне адсутнічае. Сучасная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэстаўрацыйная практыка, на жаль, не заснавана на прынцыпе належнай археалагічнай рэстаўрацыі (г. зн. руплівым, метадычным вывучэнні помніка ў арыгінале, падобным да вывучэння аб'екта археалогіі).

Актуальная задача — стварэнне навукова-даследчага цэнтра (інстытута рэстаўрацыі) для распрацоўкі і ўкаранення сучасных рэстаўрацыйных прынцыпаў, норм і методык, новых тэхналогій, якія адпавядаюць спецыфіцы беларускай спадчыны, ацэнкі якасці матэрыялаў і работ, атэстацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў. Мэтазгодная падрыхтоўка спецыялістаў па рэстаўрацыі і ахове спадчыны ў сістэме сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі на аснове дзяржаўных заказаў.

Іншыя меры па забеспячэнні рэстаўрацыйнай дзейнасці: дакладная дыферэнцыяцыя, устанаўленне норм і расцэнак на ўсе віды рэстаўрацыйных работ; забеспячэнне і абарона аўтарскіх правоў праз выкарыстанне там, дзе гэта магчыма, знакаў якасці, сертыфікатаў майстэрства; прапаганда якасці рэстаўрацыйных работ з дапамогай выставак, конкурсаў, майстэрняў рамеснікаў у турыстычных зонах; заахвочванне вучобы, прадастаўленне грантаў; стварэнне майстар-класаў, стымулюючых як высакакласных спецыялістаў, так і таленавітую моладзь, якая жадае авалодаць сакрэтамі майстэрства; шырокае інфарміраванне грамадскасці праз сродкі масавай інфармацыі. Гэта павінна павысіць каштоўнасць і сацыяльна-эканамічную значнасць рэстаўрацыі.

*Сучасная архітэктура ў кантэксце аховы культурнай спадчыны*

Полацк — горад, які развіваецца, таму ўзгадненне інтарэсаў аховы культурнай спадчыны з неабходнасцю развіцця і рэканструкцыі тэрыторый — адна з важнейшых задач.



Інтэграцыя сучаснай архітэктуры ў гістарычную забудову перыядычна ўзнікае ў тэорыі і практыцы ахоўнай справы. Новая архітэктура ў кантэксце гістарычнага асяроддзя — адна з важнейшых складаючых стратэгіі захавання культурнай спадчыны. Зоны рэгулявання забудовы вызначаюць магчымасці новага будаўніцтва на тэрыторыях незавершанага або дэградзіраванага горадабудаўнічага асяроддзя, разарваных вулічных франтоў, унутрыквартальных участках і на месцах страчаных будынкаў. Новае будаўніцтва павінна служыць рэстаўрацыі горадабудаўнічай тканіны, узнаўленню страчаных элементаў гарадскога ландшафту, планіровачнай структуры, маштабу, чляненняў, рытму, сілуэта, візуальных сувязей, прасторавых адносін забудовы. Існуюць розныя прыёмы гарманічнага ўключэння сучаснай архітэктуры ў групы гістарычных пабудоў: ад поўнага «растварэння» новых архітэктурных аб'ёмаў, матэрыялаў і колераў у акаляючым асяроддзі да метадаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«кантрапункта», разнастайных стылізацый і ўзнаўленняў сродкамі новага будаўніцтва, новымі тэхналогіямі і матэрыяламі. У адрозненні ад узнаўлення, якое ставіць памылковы знак роўнасці паміж арыгіналам і навадзелам, рэгенерацыя і рэнавацыя, як больш творчыя метады, дыктуюць новай архітэктуры неабходнасць выяўлення ўнутраных заканамернасцей гістарычнага асяроддзя, архітэктоніку мастацкіх вобразаў. Найбольш эфектыўны спосаб захавання і папулярызацыі гістарычнага асяроддзя ўяўляе сабой уцягненне адкрытых прастораў у сацыяльнае абарачэнне шляхам развіцця пешаходных зон і іх інфраструктуры. Стварэнню камфортнай абстаноўкі ў гістарычным цэнтры спрыяюць яго добраўпарадкаванне, азеляненне, асвятленне і ўстаноўка малых архітэктурных форм, сумаштабных акаляючаму асяроддзю і адпаведных яго эстэтыцы.

У мэтах захавання аб'ектаў культурнай спадчыны і развіцця прынятых прававых актаў, рэгулюючых прававыя адносіны ў сферы дзяржаўнай аховы спадчыны: унесці прапановы і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (№ 98-З) ад 09.01.2006 г.; у мэтах стварэння больш эфектыўнай сістэмы кантролю і выпрацоўкі гарманічнага развіцця асяроддзя, акружаючага ахоўныя гісторыка-культурныя аб'екты, уключыць у заканадаўчыя і нарматыўныя акты шэраг паняццяў (унікальная гістарычная тэрыторыя, гістарычны горад, горад-музей, гістарычны ландшафт), якія не былі ўнесены як асобныя катэгорыі ў зараз дзеючыя ахоўныя дакументы; гэта значна дапаможа спецыялістам у рабоце па ахове цэласнай гарадской прасторы, што склалася гістарычна, і распрацоўцы рэгламенту горадабудаўнічай і гаспадарчай дзейнасці для суб'ектаў гаспадарання, накіраванай на стварэнне сістэмы мерапрыемстваў па забеспячэнню захаванасці ўстойлівых прасторавых утварэнняў; прадугледзець норму аб магчымасці выдзялення ўласніку аб'екта культурнай спадчыны бюджэтных субсідый на фінансаванне затрат па захаванню аб'екта ў выпадку, калі рэжым гаспадарчай дзейнасці гэтага аб'екта, устаноўлены ў мэтах яго захавання, не дазваляе забяспечыць рэнтабельнае выкарыстанне аб'екта; асабліва каштоўныя аб'екты культурнай спадчыны, уключаныя ў Спіс Сусветнай спадчыны, гісторыка-культурныя запаведнікі, аб'екты археалагічнай спадчыны не павінны падлягаць адчужэнню з дзяржаўнай уласнасці; прадугледзець абавязковае страхаванне рызыкі страты і пашкоджання аб'ектаў культурнай спадчыны пры правядзенні рамонтна-будаўнічых работ, а таксама ў выпадку стыхійнага бедства з умовай, што страхавая выплата накіроўваецца на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзнаўленне страчанага ці пашкоджанага аб'екта; распрацаваць і зацвердзіць на рэспубліканскім узроўні рэстаўрацыйныя нормы і правілы па падрыхтоўцы, узгадненню і зацвярджэнню праектнай і сметнай дакументацыі на выкананне работ па захаванню аб'ектаў культурнай спадчыны; распрацаваць Правілы землекарыстання і забудовы Полацка, якія ўключаюць у сябе карты горадабудаўнічага зaніравання з указаннем межаў заніравання і рэгламентаў гранічных памераў і параметраў; устанавіць парадак аднясення зямель да катэгорыі зямель гісторыка-культурнага прызначэння рэгіянальнага значэння і ў сувязі з гэтым прадугледзець падатковыя льготы; уключыць палітыку актыўнага захавання культурнай спадчыны ў якасці састаўной часткі ўсіх аспектаў гарадскога планіравання; стварыць клімат спрыяння грамадскім і прыватным інвестыцыям у культурную спадчыну; комплексна падысці да вырашэння пытанняў навукова-тэхнічных і даследчых мерапрыемстваў, якія папярэднічаюць мерапрыемствам па ахове гістарычнага цэнтра (выяўленне і вызначэнне каштоўнасці, карэкціроўка Спіса, фарміраванне адзінай базы даных аб гісторыка-культурнай спадчыне і забеспячэнне сувязі з базамі даных па геалогіі, гідралогіі і экалогіі, пастаянны маніторынг усіх працэсаў разбурэння, вывучэнне спосабаў прыпынення і прычын працэсаў разбурэння, скарачэнне колькасці забруджвальнікаў); неабходная распрацоўка мадэлі культурнага турызму, якая адрозніваецца ад звычайных відаў масавага турызму, каб пазбегнуць лішняй нагрузкі на аб'екты культурнай спадчыны.



Ахова культурнай спадчыны — глабальная праблема сучаснасці побач з экалагічнай, энергетычнай, дэмаграфічнай і інш. Для яе вырашэння патрабуюцца намаганні сусветнай грамадскасці ў цэлым. Кіруючыся нормамі Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны варта актывізаваць міжнароднае супрацоўніцтва, праводзіць абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй і публікацыямі з міжнароднымі арганізацыямі, якія дзейнічаюць у сферы захавання помнікаў, прыцягваць замежных экспертаў для ўдзелу ў вырашэнні найбольш важных пытанняў захавання культурнай спадчыны Полацка.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь : Закон Рэспублікі Беларусь, 12 снеж. 2005 г., № 70-З : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 18.07.2007 г. // КонсультантПлюс : Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2008.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 18.07.2007 г. // КонсультантПлюс : Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2008.

3. Гліньнік, В. Мажлівасьці музеефікацыі гістарычнага цэнтра Полацка на прынцыпах «унікальнае гістарычнае тэрыторыі» / В. Гліньнік // Полац. гіст.-культур. запаведнік ; укл. Т. А. Джумантаева ; Матэрыялы II Міжнар. канф. па праблемах музеефікацыі ўнікальных гістарычных тэрыторый. — Полацк, 1996. — С. 6—8.

4. Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по охране культурного наследия / сост. В. В. Глинник. — Беларус. фонд культуры, Науч.-техн. гос. предприятие «Белинформреставрация». — 2-е изд., доп. — Минск : Тыдзень, 2000. — 193 с.

Таццяна Шаляговіч

дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (г. Мінск, Беларусь)



## Прысутнасць музея ў сацыяльнай сетцы: шляхі засваення новых тэхналогій

Інтэрнэт за апошняе дзесяцігоддзе стала ўвайшоў у наша жыццё, і займае ўсё большае месца ў інфармацыйным полі. З дапамогай інтэрнэта мы знаходзім звесткі аб падзеях у свеце, культурных мерапрыемствах, падтрымліваем сувязі з сябрамі і знаёмымі, а таксама выкарыстоўваем яго ў прафесійнай дзейнасці.

У XXI ст. амаль кожная ўстанова мае ўласны сайт, на якім прэзентуе сваю дзейнасць, але тут мы сутыкаемся з некаторымі праблемамі. Далёка не кожная дзяржаўная ўстанова сферы культуры можа дазволіць сабе мець у штаце ўласнага праграміста альбо адміністратара сецевога рэсурсу, з-за чаго праца сайта носіць даволі статычны характар і часта суправаджаецца збоямі. Да таго ж, дадзеныя сайты афармляюцца па вызначаных стандартах: інфармацыйны блок, навіны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ